WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

24 СТУДЗЕНЯ 2012 г.
АЎТОРАК
№ 14
(27129)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Факт і каментарый

ДОБРЫЯ НАМЕРЫ ЎРАДА БЕЗ АКТЫЎНАСЦІ ЧЫНОЎНІКАЎ МОГУЦЬ ТАК І ЗАСТАЦЦА НА ПАПЕРЫ?

У Беларусі зацверджана стратэгія прыцягнення прамых замежных інвестыцый на перыяд да 2015 года. Пастанову аб гэтым прыняў Савет Міністраў на мінулым тыдні.

Стратэгія накіравана на стымуляванне прытоку прамых замежных інвестыцый у адпаведнасці з запатрабаваннямі структурнай перабудовы эканомікі і інавацыйным развіццём краіны, пашырэнне маштабаў і павышэнне якасці іх выкарыстання на базе пастаяннага паляпшэння інвестыцыйнага клімату, рэфармавання дзяржаўнай маёмасці і развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Беларусі. Але колькі разоў ужо казалі аб тым, што гэты самы «інвестыцыйны клімат» трэба паляпшаць, а чагосьці значнага не адбылося. Як дабіцца рэалізацыі мэт стратэгіі на практыцы?

«Звязда» звярнулася па каментар аб новым дакуменце да **дэкана эканамічнага факультэта БДУ прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА:**

— Намеры добрыя. Стратэгія добра прапісана. Але, ведаеце, калісьці кітайскі філосаф Канфуцый сказаў: «Калі я прыязджаю ў краіну, я не цікаўлюся, добрыя там законы ці дрэнныя. Я цікаўлюся, ці выконваюцца яны». Таму нават добрыя намеры ўрада пры ўмове, што чыноўнікі, якія адказваюць за прыцягненне інвестыцый, не выявяць адпаведнай актыўнасці, могуць так і застацца толькі на паперы, як гэта было з многімі папярэднімі канцэпцыямі, стратэгіямі і гэтак далей... Але яшчэ раз падкрэслю, што дакумент вельмі якасны, дакладна прапісаны прыярытэтныя кірункі, у якія неабходна прыцягваць інвестыцыі. Бо інвестыцыі ў «макдональдсы» прыйдуць самі, а нам важна ўкласці грошы ў апрацоўчую прамысловасць, навукаёмістыя сектары.

СТАР. 2

ПАКУЛЬ МАРОЗ НЕ ШЧЫПЛЕ НОС...

Фота БЕЛТА.

Два штучныя каткі пачалі працаваць на плошчы Перамогі ў Віцебску. За мінулыя выхадныя іх наведалі сотні жыхароў і гасцей абласнога цэнтра.

Надвор'е

ВЫПРАБАВАННЕ СІБІРСКІМІ МАРАЗАМІ: УНАЧЫ МЕСЦАМІ ДА МІНУС 23

У першай палове тыдня часам будзе ісці снег, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра сёння ўдзень ад 0 па захадзе да мінус 7 градусаў на ўсходзе. А вось ужо ў сераду стане халадней. Уначы на 25 студзеня будзе мінус 3—10, пры праясненнях на ўсходзе да 11—15 марозу; удзень мінус 1—8, на паўночным усходзе да мінус 10 градусаў.

У другой палове тыдня на тэрыторыю краіны завітае сібірскі антыцыклон, атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў стане значна менш. А вось з пятніцы і да нядзелі ўключна ападкаў увогуле не будзе. Тэмпература паветра ў чацвер на працягу сутак 9—15 градусаў ніжэй за нуль, па паўночным усходзе ўначы да 16—20 марозу; толькі на паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей на працягу сутак мінус 6—8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у апошнія дні тыдня маразы яшчэ ўзмоцняцца. Уначы чакаецца мінус 10—17, месцамі да 18—23 марозу; удзень мінус 7—14, у асобных раёнах да 17 градусаў ніжэй за нуль. Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон на выхадныя будзе ўжо на 6—10 градусаў ніжэйшым за кліматычную норму.

Сяргей КУРКАЧ.

Ведай нашых!

ЖАНОЧАЯ ЭСТАФЕТА ПАДАРЫЛА НАМ «СЕРАБРО», А ДАР'Я ДОМРАЧАВА — «ЗОЛАТА» Ў МАС-СТАРЦЕ

biathlonworld.com

У мінулыя выхадныя беларускія біятланісткі парадавалі балельшчыкаў двойчы: у суботу наша жаночая зборная заваявала «серабро» ў эстафеце, а ў нядзелю Дар'я Домрачава выйграла гонку з масавым стартам. Такім чынам, 6-ты этап Кубка свету ў італьянскай Антэрсельве стаў самым паспяховым для нашых біятланістак у гэтым сезоне. Гэта першы подыум нашай чацвёркі, а вось Дар'я ўжо звыкла апярэдзіла ўсіх суперніц на лыжні, у чарговы раз пацвердзіўшы статус самай хуткай гоншчыцы планеты.

Пасля фінішу ў мас-старце Дар'я дала каментарый свайму афіцыйнаму сайту:

— Учарашняя гонка ў эстафеце стала добрай трэніроўкай перад мас-стартам?

— Увесь шосты этап Кубка свету для мяне як трэніроўка. Я пачала з трэцяга месца, потым была другой у эстафеце, а цяпер выйграла! Мне здаецца, гэта была добрая праца.

— І ўражанні ад гэтага этапу самыя найлепшыя?

— Антхольц — добрае для мяне месца. Лыжня вельмі пасуе маёй тэхніцы. Мяне радуюць мае адчуванні і мой вынік.

— Падчас апошняй стральбы, калі вашы суперніцы Нойнер і Кузьміна пакідалі стрэльбішча, вы толькі рыхтаваліся страляць. Ведалі, што яны прамахнуліся?

— Вядома, ведала. Але я не думала пра гэта падчас стральбы. Гэта была бітва паміж мной і маімі мішэнямі — і больш нічога. Пра гэта лёгка казаць, а вось зрабіць — вельмі няпроста... Але сёння, сапраўды, я выдатна папрацавала.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Заўзятары «Дынама» выступілі за беларускамоўнае суправаджэнне матчаў

Заўзятары мінскага «Дынама» склалі петыцыю да арганізатараў хатніх матчаў клуба. Яны прапануюць забяспечыць беларускамоўнае дыктарскае і дыджэйскае суправаджэнне ўсіх хатніх матчаў «Дынама» на «Мінск-Арэне» з мэтай падкрэсліць самабытнасць клуба.

— Мінскія заўзятары па праве называюцца аднымі з лепшых у КХЛ, а матчы на «Мінск-Арэне», няма сумненняў, з'яўляюцца паказальнымі для ўсёй лігі: аншлагі, дружная падтрымка, прафесіяналізм ва ўсім. Але мінчанам ёсць яшчэ што паказаць... Мы прапануем не толькі даваць прыклад іншым клубам лігі, але і браць урокі ў такіх каманд, як рыжскае «Дынама» і познаньскі «Леў». «Разам да перамогі!» — гаворыцца ў заяве заўзятараў.

Гучная справа

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА ЗАВЕДЗЕНА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА БЫЛОГА ДЫРЭКТАРА УКБ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

Крымінальная справа заведзена ў дачыненні да былога дырэктара упраўлення капітальнага будаўніцтва (УКБ) Віцебскага аблвыканкама. Пра гэта паведаміў учора на прэс-канферэнцыі, прысвечанай вынікам работы міліцыі ў 2011 годзе, начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Найдзенка.

Карыстаючыся сваім службовым становішчам, кіраўнік даў указанне аб складанні і падпісанні актаў выкананых работ з завышэннем аб'ёмаў кошту пры падрыхтоўцы да летняга сезона аднаго з дзіцячых лагераў вобласці. Грошы па прэзідэнцкай праграме «Дзеці Беларусі» былі пералічаны, а работы не выкананы. Даказаны ўрон склаў больш за Br1 млрд.

У дачыненні да былога чыноўніка заведзена крымінальная справа па ч. 3 арт. 424 (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі), якая прадугледжвае да 10 гадоў пазбаўлення волі з магчымай канфіскацыяй маёмасці. Акрамя таго, разглядаецца пытанне аб завядзенні ў дачыненні да яго яшчэ дзвюх крымінальных спраў па аналагічных фактах.

Каментуючы гэты факт, Аляксандр Найдзенка адзначыў, што ў будаўнічай галіне выяўляецца дастаткова шмат карупцыйных злачынстваў, асабліва дзе фінансаванне аб'ектаў вядзецца за бюджэтны кошт. «Усе найбольш буйныя праекты мы адсочваем», — падкрэсліў ён.

Вольга БАГАЧОВА, БЕЛТА.

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

Беларусбанк прапануе сваім кліентам з 1 лютага 2012 года тэрміновы банкаўскі ўклад **«Класік плюс»** у замежнай валюце (у доларах ЗША, еўра, расійскіх рублях) з памерам асноўнага даходу **8,5% гадавых.**

Па тэрміновых банкаўскіх укладах (дэпазітах) **«Ваш выбар»** у замежнай валюце банк з 1 лютага 2012 года ўстанаўлівае асноўны даход у наступным памеры:

- у доларах ЗША, еўра:

да 2 000 (уключна)	– **7,0** працэнта гадавых;
больш за 2 000–15 000	– **7,5** працэнта гадавых;
больш за 15 000	– **8,0** працэнта гадавых;

- у расійскіх рублях:

да 50 000 (уключна)	– **7,0** працэнта гадавых;
больш за 50 000–350 000	– **7,5** працэнта гадавых;
больш за 350 000	– **8,0** працэнта гадавых.

Па прынятых да 01.02.2012 тэрміновых банкаўскіх укладах **«Ваш выбар»** у замежнай валюце ўказаныя стаўкі прымяняюцца, пачынаючы з 01.03.2012.

Па тэрміновых банкаўскіх укладах (дэпазітах) **«Прэстыж»** у замежнай валюце (у доларах ЗША, еўра) банк з 1 лютага 2012 года ўстанаўлівае асноўны даход у памеры **5,5% гадавых.**

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у Кантакт-цэнтры ААТ «АСБ Беларусбанк» па тэлефоне **147** (адзіны бясплатны даведачны нумар дзейнічае на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь). Інфармацыя аб працэнтах, выплачаных па розных відах укладаў, дэпазітаў на працягу апошняга фінансавага года з разбіўкай па месяцах размешчана на сайце **www.belarusbank.by**

Захаванасць і вяртанне ўкладаў гарантуецца ў парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці № 1 ад 28.08.2008 г., выдадзеная Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь. УНП 100325912.

ISSN 1990 - 763X

Абітурыент-2012

Па якіх праграмах рыхтавацца да ўступных іспытаў?

ПРАВІЛЫ прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы пакуль не зацверджаны, таму абітурыентам узору 2012 года застаецца кіравацца толькі той інфармацыяй, якая прасачылася ў СМІ яшчэ падчас абмеркавання змяненняў, што будуць унесены ў новы дакумент. І пакуль ніхто не можа сказаць са стапрацэнтнай гарантыяй, ці захаваецца асобны конкурс для сельскай і гарадской моладзі, хто пазбавіцца пры паступленні права на льготы, з якімі баламі ў сертыфікатах абітурыенты не будуць дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе і ці будзе павышана «вага» профільнай дысцыпліны пры падліку агульнай сумы балаў.

Тым не менш, днямі на інтэрнэт-парталах Міністэрства адукацыі (www.edu.gov.by) і Нацыянальнага інстытута адукацыі (www.adu.by) былі размешчаны праграмы ўступных іспытаў у ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на 2012 год. Трэба мець на ўвазе, што спецыфікацыя тэстаў для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання заўсёды распрацоўваецца на падставе праграм уступных іспытаў на бягучы год. Спецыфікацыя — гэта своеасаблівы алгарытм пабудовы тэста: яна вызначае яго структуру, колькасць заданняў па кожнай тэме, узровень іх складанасці і г.д .

У прыватнасці, на інтэрнэт-рэсурсах Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі прадстаўлены «Праграмы ўступных іспытаў для асоб, якія маюць агульную базавую адукацыю, для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі», «Праграмы ўступных іспытаў для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі» і «Праграма ўступных іспытаў для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі». Як паабяцалі ў прэс-службе міністэрства, крыху пазней яны будуць уключаны і ў даведнікі для абітурыентаў 2012 года.

У галоўным адукацыйным ведамстве дадалі, што праграмы распрацоўваліся з улікам 11-гадовай агульнай сярэдняй адукацыі. У рабочыя групы па распрацоўцы праграм увайшлі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, Нацыянальнага інстытута адукацыі, вышэйшых навучальных устаноў, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а таксама лепшыя педагогі краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДОБРЫЯ НАМЕРЫ ЎРАДА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нам патрэбны канкрэтныя дакументы, канкрэтныя стымулы. Лічба, пра якую гаворыцца ў стратэгіі (што пятая частка ўсіх інвестыцый павінна быць прамымі замежнымі) — вельмі вялікая. Сярэднесусветны паказчык — толькі 10%. А 20% магчымыя толькі ў перыяд інтэнсіўнай прыватызацыі. Відаць, урад мяркуе больш інтэнсіўна ажыццяўляць прыватызацыю. Важна таксама і тое, што стратэгія закранае супрацоўніцтва дзяржавы і бізнэсу — дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Аднак зноў падкрэслю, што пакуль размова не ідзе пра канкрэтныя механізмы. А для стымулявання чыноўнікаў можна выкарыстаць вопыт Кітая. Там было так: не прыцягнеш пэўную суму інвестыцый — пакладзеш партбілет.

Дарэчы, урад таксама лічыць, што выкананне стратэгіі забяспечыць уваходжанне Беларусі ў лік 30 дзяржаў з найлепшым кліматам у галіне вядзення бізнэсу па рэйтынгу Сусветнага банка «Вядзенне бізнэсу», а таксама павышэнне пазіцый у справаздачах міжнародных рэйтынгавых агенцтваў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Сама вінаватая...

Ля вёскі Вялікі Поўсвіж Лепельскага раёна 21-гадовая жанчына, кіруючы аўтамашынай «Опель», выехала на паласу сустрэчнага руху, дзе яе аўто сутыкнулася з аўтамашынай «Фальксваген Гольф». Апошняй кіраваў жыхар вёскі Зялёны Востраў.

У выніку гэтага дарожна-транспартнага здарэння пасажырка «Опеля», 25-гадовая жыхарка Віцебска, і 3-гадовая дачка кіроўцы загінулі. Як адзначылі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, сведкі расказвалі, што жанчына-кіроўца значна перавышала дазволеную хуткасць. Стан асфальтаванай дарогі быў нядрэнным. Але, на жаль, адбылася такая трагедыя...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Пабывалі ў «сяброў»

У садовым таварыстве «Сябры» (Пінскі раён) пабывалі зладзеі. Прайшліся па дачах і скралі ўсё, што траплялася пад руку.

Тут вынеслі 20 літраў бензіну, там — алюмініевы бітон, металалом... Зладзеямі аказаліся жыхары в. Лунін, што ў Лунінецкім раёне. Рабочага ААТ і даярку СВК затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.01.2012 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	8 330,00	1 чэшская крона	423,75	USD	31,3325
▼1 еўра	10 740,00	1 польскі злоты	2 502,78	10 UAH	39,0072
1 латвійскі лат	15 411,66	1 расійскі рубель	266,00	1000 BYR	37,6140
1 літоўскі літ	3 120,43	1 украінская грыўня	1 036,46	EUR	40,4064

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«ВУЛІЦУ РАСЧЫСЦЯЦЬ. СІТУАЦЫЮ БЯРЭМ НА КАНТРОЛЬ»

З вёскі Доўкінды Нясвіжскага раёна патэлефанаваў Аляксандр Кандратавіч Гуліцкі. Паскардзіўся на тое, што расчышчаюць толькі цэнтральныя вуліцы, а да другасных справа не даходзіць. З гэтай нагоды ў мінулую суботу заяўнік, паводле яго слоў, застаўся без хлеба. Папросту не змог дайсці да месца, дзе спыняецца аўтакрама, з-за снегавога покрыва.

— Мне 75 гадоў, я інвалід другой групы. Хадзіць па снежнай цаліне не магу — задыхаюся. Жонка таксама не памочнік у гэтай справе. А каго маладзейшага дапамагчы побач няма, — распавёў чытач сутнасць свайго звароту.

Мы аператыўна набралі нумар Казлоўскага сельскага Савета, на тэрыторыі якога месціцца вёска Доўкінды. Размаўлялі з кіраўніком справамі Наталляй Навумовіч. Тая, як высветлілася, добра ведае і паважае «Звязду», таму сама потым некалькі разоў тэлефанавала ў рэдакцыю, каб дадаць новыя звесткі.

Наталля Пятроўна патлумачыла, што дарогі знаходзяцца на абслугоўванні ДРСУ-168. Аднак тэхнікай дапамагае і мясцовая гаспадарка — «Новае жыццё». Дарогі расчышчаюць, але часам не спраўляюцца. Прыгадайце, як мяло ў мінулую суботу. Магчыма, проста не паспелі расчысціць тыя некалькі дзясяткаў метраў ад цэнтральнай вуліцы да вуліцы з домам заяўніка?

— Іх хата стаіць першая. Больш тут сапраўды ніхто не жыве — жанчын сталага веку пазабіралі да сябе на зіму дзеці. Увогуле, ва ўсёй вёсцы пражывае ўсяго 33 чалавекі, — патлумачыла Наталля Навумовіч.

Кіроўца справамі звязалася з майстрам ДРСУ-168, які адказвае за прыбіранне вуліц. На месца выехаў і старшыня Казлоўскага сельскага Савета. «Сітуацыю бярэм на кантроль, раз такая справа. Вуліцу, дзе пражывае ваш заяўнік, расчысцяць бліжэйшым часам».

Сяргей РАСОЛЬКА.

РЫБА НАША І ЗАМОРСКАЯ

Між іншым...

Сёння можна выбраць любую рыбу на свой смак. У крамах — шырокі асартымент марской, а рыбгасы рэгулярна падвозяць прэснаводную. Выбірай і разлічвайся.

Па сажалкавую рыбу.

Старэйшае пакаленне памятае час, калі ў былым Саюзе праводзіліся «рыбныя дні». Кожны чацвер ва ўсіх пунктах грамадскага харчавання прапаноўваліся толькі стравы з рыбы. Тады мелі пэўныя праблемы з мяснымі прадуктамі, і рыба павінна была крыху стабілізаваць сітуацыю. Цяпер здзіўляешся, чаму тыя дні не падабаліся людзям. Заходзіш у рабочую сталоўку, а там смажаны хек ці фрыкадэлькі з рыбы. У той час атлантычнага селядца чамусьці не было, а яго замяняў селядзец «івасі». Марская рыба прадавалася даволі свабодна. Мінтай ляжаў ва ўсіх вітрынах і чамусьці попытам не карыстаўся. Але ўсё гэта было, калі мы будавалі камунізм і ўжо першую фазу яго, калі не памыляюся, прайшлі.

Нядаўна вырашылі мы з жонкай купіць марской рыбы, бо менавіта ў ёй ёсць ёд, і пажадана гэтую рыбу хоць зрэдку есці. Марожанай рыбы хапае, але або цана высокая, або ў рыбы адходаў шмат. Пахадзіўшы па крамах, вырашылі купіць філе мінтая. Без касцей і цана прымальная — 30 тысяч рублёў за кілаграм, хоць у некалькіх крамах кошт дасягаў 53 тысяч.

Здавалася б, выбралі тое, што хацелі. А калі прынеслі дадому і размарозілі, то філе скурчылася і вады набралася 300 грамаў на кілаграм. Вось табе і рыба — без галавы і касцей. Кінулі тыя палоскі мінтая на патэльню і ўбачылі ў выніку невялічкія «дулькі». (А некалі смажылі філе грэнадзёра, дык яно ператварылася ў кашападобную масу, і гэта пры цане 40 тысяч за кілаграм). Рыба расійская, а там схемы ашуканства спажыўца адпрацаваны. Што, філе спецыяльна вытрымліваюць у вадзе, а затым замарожваюць? Вазьміце рыбныя кансервы і патрасіце каля вуха. Калі знойдзеце бляшанку, у якой не будзе «боўтацца», то кансервы не расійскай вытворчасці ці вам пашанцавала. Калі купілі селядзец кавалачкамі ў пластмасавай празрыстай упакоўцы, то расолу там можа быць да 40 працэнтаў. А на выгляд усё як найлепш. Прыгожа, але не шчыльна.

Пакупнік заўсёды будзе ў пройгрышы. Можна за кілаграм вэнджанай скумбрыі заплаціць 80 тысяч, і не будзе ніякага падману, але такі кошт далёка не кожнаму па кішэні. А ў нас размова ідзе пра рыбу, якая па цане была б прымальнай для большасці. Ляжыць на прылаўках салака і мойва ў межах 15-16 тысяч за кілаграм, але ў многіх краінах гэтай рыбай кормяць толькі жывёлу.

Дык якую рыбу есці нашаму чалавеку? Народ ужо вызначыўся, і чэргі выцягваюцца каля цыстэрнаў з карпам. Сёння дзень сажалкавая рыба найбольш запатрабаваная.

Жывы (а гэта ўжо плюс) буйны карп прадаецца па 18-19 тыс./кг, а сярэдняга памеру — яшчэ на пару тысяч танней. Лічыцца, што ў прэснаводнай рыбы шмат адходу, але гэта толькі на першы погляд. З галоў таго ж карпа можна прыгатаваць выдатную юшку, толькі неабходна выкінуць жабры. І атрымаецца, што ў нашых умовах сажалкавай рыбе альтэрнатывы няма.

Вырас попыт — і рыбгасы ажылі. Напрыклад, рыбгас «Лактышы» (Ганцавіцкі раён) летась рэалізаваў прадукцыі на 38 працэнтаў больш, чым у 2010 годзе. Калі раней гаспадарка несла страты, то ў мінулым годзе рэнтабельнасць перавысіла 9 працэнтаў.

Нашы рыбгасы ў асноўным робяць стаўку на карпа. У аб'ёме вытворчасці гэтая рыба ў рыбгасе «Сялец» (Бярозаўскі раён) займае 80 працэнтаў. А яшчэ гадуецца белы амур, таўсталобік, шчупак, карась... У гэтай гаспадарцы з 2006 года вядзецца вырошчванне асятровай рыбы — асятра, сцерлядзі, стронгі. Але гэтая рыба не для масавага спажыўца. Стронгу паспрабаваць не давялося, а ў краме ляжыць. Праўда, і цана «кусаецца» — 100 тысяч рублёў за кг.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЛЮБІЦЬ ПРЫРОДУ НАВУЧЫЦЬ КНІГА

Спецыяльна ў Год кнігі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць дабрачынную акцыю «Экалагічная кніга — дзецям».

Менавіта экалагічная кніга адыгрывае значную ролю ў прапагандзе ведаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання. Яна вучыць разумнаму, добраму і душэўнаму стаўленню да ўсяго, што вакол нас — лясоў, рэк, азёр, лічаць ініцыятары акцыі. У яе рамках да канца лютага ва ўсіх рэгіёнах краіны спецыялісты абласных камітэтаў і раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя наведаюць школы і ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання, якія цягам мінулага года найбольш актыўна праводзілі працу па фарміраванні экалагічнай культуры дзяцей і моладзі. Падчас сустрэч ва ўстановы адукацыі будзе перададзена больш за 2 тысячы кніг на прыродаахоўную тэматыку («Малая дзіцячая Чырвоная кніга», дэманстрацыйныя матэрыялы «Прыродныя аб'екты і з'явы Беларусі»).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАД ЦЯЖАРАМ СНЕГУ

абваліўся металапрофільны дах склада прыватнага прадпрыемства ў Гомелі. Плошча разбурэнняў — 3200 квадратных метраў. Шасціметровая цагляная сцяна будынка, здадзенага ў эксплуатацыю толькі летась, таксама не вытрымала выпрабавання ападкамі. Пад абваленымі канструкцыямі апынуліся аўтапагрузчык і прыватны аўтамабіль. Людзей на момант аварыі ў памяшканні не было. І хоць на Гомельшчыне не зарэгістравана парушэнняў энергазабеспячэння, транспартнага руху, пашкоджання сацыяльных і іншых аб'ектаў, начальнік цэнтра прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Мікалай Адашкевіч заклікае арганізацыі своечасова арганізоўваць ачыстку дахаў ад снегу, каб папярэдзіць надзвычайныя здарэнні. Тым больш што ў бліжэйшыя два дні снег будзе ісці. Зараз ва ўсіх раёнах вобласці працягваюцца работы па прыборцы снежных сумётаў. Тэхніка прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі, а таксама прыцягнутыя транспартныя сродкі працуюць у кругласутачным рэжыме. У тым ліку супрацоўнікі ДАІ дапамагаюць арганізаваць бесперапынную работу снегаачышчальных машын. Яны ж адзначаюць, што ў снежныя дні колькасць дробных ДТЗ узрасла ў два разы, асабліва ў вялікіх населеных пунктах.

Фота МНС, ДАІ.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СУСЕДЗЯМ НЕ ПАШАНЦАВАЛА

У Віцебску адбыўся пажар у 4-пакаёвай кватэры на шостым паверсе 9-павярховага шматкватэрнага жылога дома.

Гаспадар і яго 41-гадовы сын былі выратаваны пажарнымі і пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі адпушчаны дадому. Падчас ліквідацыі пажару дзесяць суседзяў з кватэр на шостым і вышэйшых паверхах выратавальнікам прыйшлося эвакуяваць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АЎТАМАБІЛЬ АБНЯЎ СЛУП

У Бабруйску ў ДТЗ загінуў 19-гадовы кіроўца.

Фота Магілёўскай ДАІ.

21 студзеня ўдзень каля 12 гадзін на вуліцы Мінская шаша аўтамабіль «Фальксваген Джэта» ўдарыўся ў светлавую апору, кіроўца атрымаў смяротную траўму. Малады чалавек, які не справіўся з кіраваннем аўтамабіля, меў вадзіцельскі стаж толькі паўгода.

— Адсутнасць вопыту кіравання і, паводле папярэдняй інфармацыі, перавышэнне дазволенай хуткасці сталі прычынай аварыі, — каментуе **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды Магілёўскай ДАІ Вікторыя ЖЭЎНЕР.** — Усё, што засталося ад «Фальксвагена» пасля сутыкнення са слупом, сведчыць пра ліхацтва за рулём. Акрамя гэтага, істотны ўплыў на здарэнне аказала адсутнасць зімовай гумы на колах, якая так неабходна ў цяперашніх складаных метэаўмовах.

Ілона ІВАНОВА.

МАГЛО БЫЦЬ ГОРШ...

У вёсцы Адамова Полацкага раёна адбыўся пажар у будынку чыгуначнай станцыі, пабудаваным яшчэ ў XIX стагоддзі.

На месца здарэння выехала пяць адзінак пажарнай тэхнікі і пажарны цягнік. На першым паверсе будынка размяшчаліся кацельня, білетная каса, пакой дзяжурнага па станцыі і зала чакання. А другі паверх пасля рамонту, які праводзіўся ў 2008 годзе, не эксплуатаваўся.

На момант узнікнення пажару ў пакоі дзяжурнага па станцыі на першым паверсе знаходзілася работніца. Пачуўшы гул, яна выйшла на вуліцу і ўбачыла пажар у паддашкавым памяшканні кацельні.

У выніку пажару быў знішчаны дах, перакрыцці, маёмасць, часткова — сцены будынка. Паводле папярэдніх звестак, прычынай пажару стала трэшчына ў дымаходзе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЯСВІЖСКІ ПАЛАЦАВЫ... гатэль для VIP-гасцей і не толькі

Серабро з дзяржсховішча, партрэты з музеяў — гэта далёка не ўсе скарбы, якія можна будзе пабачыць у палацы

Апантаныя гісторыяй турысты цяпер на нейкі час могуць адчуць сябе жыхарамі палаца. Для гэтага не абавязкова чакаць адкрыцця ўсяго палацавага комплексу (другой чаргі), якое запланавана на вясну. Гатэльны комплекс у палацы ўжо гатовы да працы. Таму ў кожнага ёсць магчымасць на свае вочы пабачыць, да чаго ўсё ж прывяла гучная рэстаўрацыя аднаго з галоўных беларускіх помнікаў гісторыі. З новага года ў Нясвіжскім палацы паболела залаў, адкрытых для наведвання, а ў пачатку лютага адкрываецца гатэль, паведаміў дырэктар музея-запаведніка «Нясвіж» Сяргей КЛІМАЎ:

Фота БЕЛТА.

Паляўнічая зала Нясвіжскага замка.

— Ужо сёлета мы адкрылі чатыры залы, каб павялічыць прапускную здольнасць музея, адпаведна — колькасць турыстаў. У нас было іх вельмі шмат на пачатку года — гэта звязана з расійскімі канікуламі. Летась 220 тысяч турыстаў наведалі Нясвіжскі палац, у пазамінулым годзе — 170 тысяч. Сёлета чакаем 300-350 тысяч. Каб людзі ўжо зараз маглі пабачыць больш, мы яшчэ да афіцыйнага адкрыцця ўсяго комплексу адкрылі тры залы ў камяніцы. Гэта інтэр'ерныя залы XIX стагоддзя, перыяду Марыі дэ Кастэлян. Пры ёй напрыканцы XIX стагоддзя былі адноўлены інтэр'еры ў трох памяшканнях: белая бальная зала, малая сталовая зала і камінная зала, вельмі прыгожая, з італьянскімі панэлямі, якія яна адмыслова замаўляла. Гэтыя залы ў нас ўжо адрэстаўраваныя. Яшчэ адкрылі гетманаўскую залу, якая знаходзіцца на паверх вышэй за камінную. Яна будзе выкарыстоўвацца як канферэнц-зала. Там ужо стаіць мэбля, яна стылізаваная, не старая. Але там вісяць унікальныя работы, якія былі вывезены з палаца перад Другой сусветнай вайной. Гэтыя творы менавіта з Нясвіжскага палаца, якія мы ўзялі на дэпазіт у мастацкім і гістарычным музеях: тры парадныя партрэты Вішнявецкіх і Канстанцін Астрожскі. У нас дамоўленасць пакуль на год карыстання. Далей альбо падоўжым, альбо будзем замаўляць копіі. Гэтыя творы маюць гістарычную каштоўнасць, знаходзіліся ў палацы, тут яны на сваім месцы.

— У Беларусі ёсць партрэты з Радзівілаўскага збору, іх можна было пабачыць на выставах. Ці можа ў палацы з'явіцца больш шырокая экспазіцыя партрэтаў з Нясвіжа?

— Цікавасць да Нясвіжа вялікая, і людзі хадзілі на выставы партрэтаў, якія маюць большую гістарычную каштоўнасць, чым мастацкую. Гэта партрэты прадстаўнікоў адной сям'і, тых радоў, з якімі яны падтрымлівалі адносіны. Вядома, у інтэр'ерах яны глядзяцца па-іншаму: адчуваецца аўра палаца, адразу з'яўляецца дух часу. Мы збіраемся ўзяць на дэпазіт 42 партрэты з тых, што ёсць у Беларусі (усяго іх больш за 60). Яны рознай каштоўнасці, не ўсе нам падыходзяць. Таму што ёсць канцэпцыя, як прадставіць гісторыю Радзівілаў і Беларусі ў інтэр'ерах Нясвіжскага палаца, які жыў уласным жыццём 400 гадоў. Мяняліся гаспадары, мяняліся густы, мода, настрой, уладары самі перабудоўвалі палац — гэта быў іх дом, а не музей. Зараз трэба знайсці нейкія акцэнты, каб паказаць у поўным аб'ёме ўсю гісторыю. Не толькі час Радзівіла Сіроткі ці Марыі дэ Кастэлян (хоць яна вельмі шмат зрабіла), ці апошніх гаспадароў. Будуць блокі, якія прадстаўляюць увесь гэты род на працягу шматгадовай гісторыі краіны, у якой яны жылі.

— І як пра ўсё гэта распавесці падчас экскурсіі, абмежаванай у часе?

— У нас зроблена поўная турысцкая інфраструктура, распрацаваны поўны турысцкі пакет. У асноўным гэта экскурсіі, якія аплачваюцца па безнаяўным разліку. Летам быў такі наплыў, што заказы прымалі на паўтара месяца наперад. Але і тых, хто прыязджае неарганізавана, мы абслугоўваем.

З замежнымі турыстамі працуюць беларускія тураператары, ёсць буйныя, якія гатовыя з намі заключыць пагадненне на дзесяць гадоў наперад: напрыклад, па суботах на тры гадзіны. У нас ёсць аддзел, які займаецца прыёмам заказаў, маркетынгам і сувязямі з грамадскасцю. Нам важна цяпер «раскруціць» праект. Бігборды ставім (9 паставілі), друкаваную прадукцыю выдалі. Для турыстаў ужо працуе кавярня, неўзабаве адкрыецца рэстаран у інтэр'ерах XVIII стагоддзя. І два гатэлі.

Адзін — VIP-гатэль, усяго чатыры нумары, але яны шыкоўныя. Другі — гатэль эканом-класа. Калісьці ў гэтым будынку былі стайні, за савецкім часам там месцілася грязелячэбніца санаторыя. Зараз будынак значна мадэрнізаваны, нумары хоць і не вялікія, але вельмі добрыя. Усяго гатэль на 49 месцаў. Ён будзе адкрыты з 5 лютага.

— Для каго гатэль у палацы будзе даступны?

— Нумары адна-, двух- і трохмесныя вельмі невялікія, таму кошт будзе даступны. У нумарах тэлевізары, поўны турысцкі сэрвіс. Вельмі шмат да нас прыязджае маладых людзей з усёй Беларусі — на выхадныя. Для іх пажыць у палацы было б вельмі цікава. Прыязджаюць і расіяне. Напэўна, наш гатэль пуставаць не будзе.

— Гатэльныя нумары ў гістарычным стылі афармленыя?

— Не, там універсальны еўрапейскі стыль, што тычыцца гатэля эканом-класа. Дабротная мэбля, зробленая па індывідуальным праекце для гэтага гатэля. Тэндар на яе выраб выйграў «Бабруйскдрэў», там стылізацый няма. Іншая справа — VIP-нумары. Але гэта аўтэнтычныя старыя пакоі. Моцнай стылізацыі няма, справа ў тым, што яны знаходзяцца ў адным са старэйшых памяшканняў — у камяніцы, якая была пабудавана на пачатку XVII стагоддзя, праўда, потым перабудоўвалася. Краявід з акна вельмі прыгожы: парк, дамба, мост... Частка нумароў выходзіць на двор палаца. Усё зроблена адпаведна духу — лепка, пазалота. Вельмі добрая мэбля. І адразу з гэтага гатэля ўваход у канферэнц-залу. Гэта адзін комплекс: рэстаран, гатэль і праход у канферэнц-залу (гістарычную гетманаўскую залу).

— Складана напаўняць такія помнікі мэбляй, якая б адпавядала духу палаца?

— Гэта праблема была ў музеі раней. Калі пачыналі ствараць запаведнік, як ні сумна, была вельмі сырая канцэпцыя музейнага паказу. Прынялі рашэнне набываць мэблю на аўкцыёнах. Скупіць дарагую антыкварную мэблю на еўрапейскіх аўкцыёнах, нешта радзівілаўскае адшукаць — немагчыма. За гэтыя гады ўсплыў толькі адзін гарнітур, які меў дачыненне да Радзівілаў, ды і то не да нясвіжскіх. Па-другое, не заўсёды ў палацы была якасная мэбля, асабліва ў XX стагоддзі. У сярэдзіне XIX стагоддзя палац стаяў сорак гадоў без гаспадароў, усё прыходзіла да ўпадку, гніла падлога, правальваўся дах. Гэта паводле слоў Марыі дэ Кастэлян. Апошнія Радзівілы імкнуліся напоўніць палац, аднавіць інтэр'еры, але тых багацця ўжо не было, як у Пане Каханку ці яго папярэднікаў, не было мануфактур, земляў. Яны купілі, што было даступна. Нават на фотаздымках з сямейнага альбома відаць, што яны перасоўвалі з аднаго месца на другое некаторыя прадметы інтэр'еру, карціны, каб паказаць, што палац напоўнены.

Стаяла пытанне ўжо на пачатку гэтага года: ці варта рабіць навадзелы па пэўных узорах мэблі? На сённяшні момант у Беларусі не робяць карэктнай рэканструкцыі мэблі, і тое, што нам прапаноўвалася, было яўным кічам, яшчэ і вельмі дарагім. Можа, лепей было б адысці ад гэтага і шукаць невялікія прадметы з радзівілаўскіх калекцый ці тыя, якія маюць да іх дачыненне? Адысці ад мэбліроўкі пакояў: усё роўна немагчыма аднавіць так, як гэта было. Часта гучала пытанне: чаму палац аднаўляецца на XX стагоддзе, на XIX, на XVIII? Але ж няма таго паветра, няма тых людзей, няма тых майстроў... Таму была прынятая канцэпцыя, якая паказвае ўсю гісторыю роду Радзівілаў, а праз іх гісторыю нашай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага — з максімальным набліжэннем да арыгінала, з пошукам арыгінальных рэчаў. Я маю на ўвазе дэпазіты — 42 карціны з беларускіх музеяў, 186 прадметаў з касцёла Божага Цела, якія мелі дачыненне да Радзівілаў, няхай і не да самога палаца, але Радзівілы фундавалі манастыры — і ўніяцкія, і каталіцкія, і праваслаўныя. Прадметы захаваў вельмі неардынарны чалавек Гжэгаш Каласоўскі, які доўгі час быў пробашчам Нясвіжскага касцёла. Ён ад вайны збіраў гэтыя рэчы. Удалося ў касцёле знайсці цікавыя рэчы XVII—XVIII стагоддзяў. І далей ідзе пошук. Вельмі дапамагаюць валанцёры сайта radziwil.by, яны знаходзяць рэчы на аўкцыёнах, нешта нам удалося набыць. Але мы набываем толькі прадметныя рэчы, не купляем усё, абы гэта было старадаўняе. З намі працуюць мастацтвазнаўцы, у прыватнасці, Вольга Бажэнава, гэта лепшы спецыяліст па тэме Радзівілаў у Беларусі. Яна напісала канцэпцыю музеефікацыі, згодна з якой мы кожную рэч вывяраем: як яна будзе ў інтэр'еры, ці падыходзіць яна па часе, па стылі. Мы не робім радзівілаўскія інтэр'еры — гэта немагчыма. Іх саміх зараз няма ў Нясвіжы. Але мы стараемся аднавіць дух эпохі. Зараз мы ўжо мэблю не набываем — яе дастаткова. Мы купляем прадметы, аналагі якіх маглі быць у палацы. Дзяржсховішча Міністэрства фінансаў Беларусі нам перадало 48 кілаграмаў сярэбраных рэчаў — чатыры вялікія мяхі. Зараз мы іх апісваем. Серабро, якое магло быць палацавым, прадставім у экспазіцыі. Што не палацавае, тое будзе прадстаўлена ў рамках выставы бытавога серабра XIX стагоддзя, якую мы рыхтуем.

Інтэр'ер Нясвіжскага гатэля.

Зараз манціруем вітрыны — іх у нас 31. Напаўняем экспанатамі. Але мы не выкарыстоўваем тыя залы, дзе ёсць гістарычныя інтэр'еры — там будзе толькі гістарычная абстаноўка: гадзіннікі, вазы, мэбля, іншыя прадметы. Музейныя вітрыны будуць стаяць толькі ў тых памяшканнях, дзе страчаны аўтэнтычныя інтэр'еры.

— Для такіх музеяў важна, каб была добра праведзена экскурсія. Вы ўжо распрацавалі маршруты і падрыхтавалі экскурсаводаў?

— У нас адпрацаваны восем маршрутаў па палацы. Стаяла задача, каб адначасова прыняць максімальную колькасць: зараз у палацы могуць хадзіць 850 чалавек. Але яны не перашкаджаюць адзін аднаму, групы ручаінкамі расцякаюцца па паверхах. І яшчэ дададуцца два маршруты: па валах і сутарэннях (летам). Будзе рамантычны маршрут з выкарыстаннем краявідаў з вокнаў, з успамінамі пра стары палац, з прымяненнем мультымедыйных тэхналогій. Зараз ён у стадыі распрацоўкі. Мы набылі некалькі сучасных інфакіёскаў, было дастаткова сродкаў на гэта. Набылі аўдыягіды, якімі можа карыстацца чалавек, які не хоча хадзіць з экскурсіяй. Запісваем экскурсію на чатырох мовах, будзе патрэба, запішам і больш, магчымасці ёсць праслухаць экскурс на 12-ці мовах. Будзе так званы тургід: экскурсавод ідзе, а ўся група слухае яго праз навушнікі, каб не перашкаджаць іншым. Будуць і спецэфекты, і Чорная панна будзе з'яўляцца...

— Лёс Панны вядомы, але шмат каго трывожыць лёс вежы, выгляд якой вельмі змяніла рэстаўрацыя...

— Не магу сказаць, што гэта гістарычны выгляд вежы, але так яна паказана на гравюры Макоўскага. І калі быў першы праект рэстаўрацыі (магчыма, ён быў сыры), вырашылі аднаўляць вежу такім чынам. Але я не магу дакладна ведаць, паколькі яшчэ не працаваў у музеі. Магчыма, прынялі рашэнне пра вежу, але не было агульнага рашэння наконт рэстаўрацыі і рэканструкцыі палаца. А калі гэтае рашэнне прынялі, вежа ўжо была зроблена. Потым увесь астатні аб'ём палаца рэканструяваўся на іншы час, і вежа зараз дысануе. Але Міністэрства культуры і навуковы кіраўнік прынялі рашэнне папраўіць выгляд вежы. І Радзівілы вельмі прасілі вярнуць, як было на іх памяці. Зараз сабралі сродкі — каля 650 мільёнаў на наш дабрачынны рахунак (гэтая справа будзе рабіцца не за дзяржаўны кошт), і як толькі пацяплее, стаіць задача як мага хутчэй перарабіць вежу. Каб яна была ў адным стылі, у якім адрэстаўраваны палац.

— Сёлета Нясвіж можа стаць не прызначанай, а сапраўднай культурнай сталіцай — калі ў палац вернецца жыццё. Якім чынам можна яго вярнуць?

— У палацы цэлы год будуць праходзіць імпрэзы — музейныя, тэатральныя, вечарыны опернай музыкі (ёсць тэатральная зала на 110 месцаў). Набыты вельмі дарагі чэшскі раяль, зроблены пад заказ. На ім ужо паіграў піяніст Юрый Бліноў, сказаў, што вельмі добры інструмент. Мы б хацелі праводзіць прафесійныя конкурсы ў Нясвіжы, таму што месца прывабнае — гатэль, канферэнц-зала. У перспектыве хацелі б і добры арган — у палацы ёсць трохярусная капліца з добрай акустыкай. На ярусах нават ужо стаяць крэслы. У капліцы адноўлены алтар, для яго падаравалі абраз прадстаўнікі роду Радзівілаў, але не тыя, якія маглі б мець прамыя адносіны да палаца, як, напрыклад, Эльжбета Радзівіл-Тамашэўская. Перадапошні ардынат Нясвіжа быў яе бацька, апошні — дзядзька Леан. Але ў 1939 годзе польскі ўрад скасаваў ардынацыю. І наша заканадаўства не дазваляе прэтэндаваць на валоданне палацам. Радзівілаў дагэтуль сюды цягне. Прыязджаюць Канстанцін і Мацей Радзівілы, але яны з Шыдлавецкай лініі. Дзед Мацея ўладарыў Паланечкай, значным маёнткам для Нясвіжа. Ёсць яшчэ ў Амерыцы Караль Радзівіл, які ніколі не прэтэндаваў на Нясвіж, ёсць пісьменніца Крысціна Радзівіл... Іх шмат па ўсім свеце, мы шукаем з імі кантакты, але найбольшы інтарэс да Нясвіжа праяўляюць Эльжбета, Мацей і Канстанцін, а таксама Эльжбецін унук Аляксандр Тамашэўскі з Францыі.

— Хоць цяпер яны не гаспадары, аднак выказалі незадаволенасць аднаўленнем Нясвіжскага палаца. Наогул крытыкі было шмат. Грамадства вельмі зацікаўлена назірала за гэтай рэстаўрацыяй, што для помніка гісторыі, напэўна, добра: ёсць да яго цікавасць. Значыць, паедуць людзі, каб паглядзець, што атрымалася.

— Пані Эльжбета памятае палац адным, ён быў ужо не ў лепшым стане, да 1939-га года неаднойчы разрабаваны, перабудаваны. Але той выгляд, у якім ён аднавіўся, узяты з гістарычных інвентароў, там распісана, што дзе было. Была пазалота, была лепка, былі каміны — значыць, так і павінна быць сёння. Праводзілася навуковае даследаванне, не магу каментаваць, наколькі яно глыбокае, але яно задакументаванае, прынятае Радай па рэстаўрацыі і рэалізавана. Ад камісіі ЮНЕСКА рэстаўрацыя атрымала высокую адзнаку. Потым прыязджалі дырэктары польскіх музеяў з Кракава, Вроцлава, Варшавы і іншых. Яны прызналіся, што баяліся ехаць у Нясвіж, але тое, што яны ўбачылі, ацанілі на высокім узроўні. Наконт канцэпцыі музеефікацыі напісаў цудоўны водгук прафесар Тадэвуш Бернатовіч, чалавек, які вельмі шмат зрабіў для таго, каб Нясвіж стаў аб'ектам ЮНЕСКА. У такой складанай справе, як рэстаўрацыя і стварэнне музея, важная ацэнка сапраўдных прафесіяналаў.

Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.

ВЫСОКІ І ВЫСОКАЯ

Грандыёзна выглядаюць вежы бетонна-растворнага вузла.

19 чэрвеня 2009 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў ва ўрачыстай абстаноўцы заклалі першы падмурак буйнога хімічнага камбіната. Было прынята рашэнне і складзена рамачнае пагадненне паміж ГК «Туркменхімія» і ААТ «Белгархімпрам» на будаўніцтва горна-ўзбагачальнага камбіната па вытворчасці калійных угнаенняў. Паміж бакамі падпісаны кантракт на будаўніцтва «пад ключ» коштам 1 мільярд долараў ЗША.

Варта адзначыць, што ў жорсткай канкурэнтнай барацьбе са шматлікімі магутнымі замежнымі кампаніямі тэндар на будаўніцтва горна-ўзбагачальнага комплексу выйграла беларуская кампанія — адкрытае акцыянернае таварыства «Белгархімпрам», стаўшы асноўным праекціроўшчыкам і генпадрадчыкам. Як найважнейшы аб'ект для эканомікі Туркменістана будоўля знаходзіцца пад патранажам і кантролем Прэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь і Туркменістана, дзякуючы чаму ёй нададзены асобы статус, які дазваляе вырашаць найскладанейшыя задачы, што ўзнікаюць падчас рэалізацыі праекта.

За час рэалізацыі праекта ААТ «Белгархімпрам» праведзена вялікая работа па праектаванні і будаўніцтве горна-ўзбагачальнага комплексу магутнасцю 1,4 млн тон хларыду калію ў год на базе Гарлыкскага радовішча калійных руд у Лебапскім велаяце з прымяненнем наяўных у ААТ «Белгархімпрам» перадавых запатэнтаваных тэхналогій, «ноу-хау» якія дазваляюць значна знізіць сабекошт, павысіць эфектыўнасць і беспрэцэдэнтна скараціць тэрміны будаўніцтва і ўводу ў эксплуатацыю горна-ўзбагачальнага камбіната. Дастаткова сказаць, што калі тэрміны будаўніцтва аналагічных па вытворчай магутнасці калійных прадпрыемстваў складаюць звычайна 8–9 гадоў, то на Гарлыкскім радовішчы новае прадпрыемства будзе ўведзена ў эксплуатацыю на працягу 5 гадоў. Дзякуючы перадавым тэхналогіям, тармазным сістэмам, новым спосабам разгрузкі скіпа, найноўшаму абсталяванню ўзбагачальнай фабрыкі навукоўцы-даследчы і праектна-канструктарскі інстытут «Белгархімпрам» займае самыя перадавыя пазіцыі ў свеце.

За час рэалізацыі праекта ААТ «Белгархімпрам» праведзена вялікая работа па праектаванні і будаўніцтве горна-ўзбагачальнага комплексу магутнасцю 1,4 млн тон хларыду калію ў год на базе Гарлыкскага радовішча калійных руд у Лебапскім велаяце з прымяненнем наяўных у ААТ «Белгархімпрам» перадавых запатэнтаваных тэхналогій.

Гарлыкскі горна-ўзбагачальны комплекс. Цягнік-«вусень» сярод бяскрайняга стэпу.

Важнасць будаўніцтва горна-ўзбагачальнага камбіната ў чарговы раз пацверджана 17 студзеня 2012 года падчас візіту Прэзідэнта Гурбангулы Бердымухамедава, які наведаў Лебапскі велаят, дзе азнаёміўся з ходам рэалізацыі на месцах праграмы сацыяльнага і прамысловага развіцця рэгіёна, будаўніцтвам шэрагу найбуйнейшых індустрыяльных аб'ектаў, у тым ліку горна-ўзбагачальнага комплексу па вытворчасці калійных угнаенняў — праекта, які ажыццяўляецца ў супрацоўніцтве з беларускімі партнёрамі. Спецыяльна па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь напярэдадні ў Туркменістан прыбыла ўрадавая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам.

Сёння двухбаковае ўзаемадзеянне набывае ўсё больш дынамічны і паступальны характар. У выніку рэгулярных сустрэч і ўзаемных візітаў за кароткі перыяд часу нашым краінам ўдалося выйсці на якасна новую прыступку супрацоўніцтва ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай і культурна-гуманітарнай сферах.

Прэзідэнт Гурбангулы Бердымухамедаў выказаў упэўненасць, што сённяшні візіт прадстаўнікоў Беларусі дазволіць яшчэ больш умацаваць традыцыйныя адносіны сяброўства і партнёрства паміж дзвюма дзяржавамі.

Адным з яркіх прыкладаў эфектыўнасці туркменабеларускага партнёрства кіраўнік дзяржавы назваў праект будаўніцтва Гарлыкскага горна-ўзбагачальнага камбіната, які павінен стаць флагманам хімічнай прамысловасці Туркменістана. Прэзідэнт Гурбангулы Бердымухамедаў падкрэсліў, што паспяховаму ажыццяўленню гэтага маштабнага праекта надаецца асаблівае значэнне і туркменскі бок зацікаўлены ў вырашэнні ўсіх бягучых пытанняў, звязаных з яго рэалізацыяй.

У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч выказаў вялікае жаданне Беларусі да самага шырокага ўзаемадзеяння з Туркменістанам, які зарэкамендаваў сябе як надзейны партнёр, з вялікім эканамічным патэнцыялам.

Гэта асаблівая адказнасць — стаць асноўным партнёрам Туркменістана ў рэалізацыі грандыёзнай задумы комплекснага засваення Гарлыкскага радовішча, працягнуў прэм'ер-міністр, адзначыўшы, што гэты праект прадугледжвае не толькі ўзвядзенне буйнога прамысловага прадпрыемства і пастаўку сучаснай тэхнікі, але і навучанне туркменскіх спецыялістаў, перадачу вопыту. Мы гатовыя забяспечыць глыбокую распрацоўку гэтага, а ў перспектыве і іншых радовішчаў Туркменістана, сказаў Міхаіл Мясніковіч, запэўніўшы, што Беларусь цалкам гарантуе выкананне сваіх партнёрскіх абавязацельстваў.

Прэзідэнт Туркменістана і прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь наведалі пасёлак Гарлык Койтэндагскага этрапа Лебапскага велаята, дзе цяпер поўным ходам ідзе будаўніцтва горна-ўзбагачальнага камбіната па вытворчасці калійных угнаенняў. Прэзідэнт Туркменістана адзначыў усе перавагі будаўніцтва гэтага аб'екта. Па-першае, мы асвойваем зямлю, каласальныя сыравінныя рэсурсы, якія ставім на службу на карысць народа. Па-другое, паводле нацыянальных праграм і ўсенародна падтрыманай стратэгіі развіцця краіны, засноўваем адпаведную духу часу буйную прамысловую вытворчасць, і гэта яшчэ адзін крок для ператварэння Туркменістана ў развітую індустрыяльную дзяржаву. І па-трэцяе, мы ствараем новыя працоўныя месцы, будуем новыя гарады і пасёлкі, гэта значыць — забяспечваем новыя прамысловыя магутнасці адпаведнай сацыяльнай інфраструктурай.

Што датычыцца канкрэтна наладжвання ўласнай вытворчасці высакаякасных мінеральных угнаенняў, патрэбы ў якіх у кантэксце аграрнай рэформы, якая ажыццяўляецца ў краіне, нарошчвання аб'ёмаў выпуску разнастайнай сельгаспрадукцыі, забеспячэння харчовага багацця пастаянна

ДАВЕР АДКАЗНАСЦЬ

растуць, то яна дазволіць не толькі адмовіцца ад імпарту дарагіх калійных угнаенняў, але і пастаўляць на сусветны рынак гэтую прадукцыю.

Пры наяўнасці найбуйнейшых запасаў неабходнай сыравіны мы не можам грэбаваць магчымасцю іх рацыянальнага выкарыстання, падкрэсліў Прэзідэнт Гурбангулы Бердымухамедаў. Развіваючы прамысловую вытворчасць, мы ствараем аснову для эканамічнага і сацыяльнага росту. Бо там, дзе ёсць індустрыя, будуць квітнеючыя гарады і пасёлкі, а там, дзе працвітаюць гарады і сёлы — людзі будуць жыць у дабрабыце, у шчасці і ў здароўі.

Будаўніцтва ў раёне Гарлыкскага радовішча горна-ўзбагачальнага комплексу па вытворчасці амаль 1,4 мільёна тон калійных угнаенняў у год стане адпраўным пунктам для новых высокіх дасягненняў у засваенні найбагацейшых падземных кладовак, надзейным гарантам няўхільнага павышэння ўзроўню дабрабыту туркменскага народа і ўмацавання эканамічнай моцы дзяржавы.

Такім чынам, новае прадпрыемства, падмурак якога быў закладзены 19 чэрвеня 2009 года пры ўдзеле Прэзідэнта Туркменістана і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, упіша залатую старонку ў летапіс поспехаў і перамог нашай эпохі, а таксама ў гісторыю туркмена-беларускіх міждзяржаўных адносін.

Будаўніцтва гэтага буйнога хімічнага камбіната сведчыць таксама пра стварэнне зусім новай для туркменскай эканомікі галіны — горна-перапрацоўчай. На тэрыторыі Туркменістана, акрамя вялікіх запасаў нафты, газу, іншых карысных выкапняў, размешчана больш за дзесяць радовішчаў з праявамі калійных соляў. Агульныя запасы толькі трох радовішчаў калійных руд папярэдне ацэньваюцца ў 2 мільярды 800 мільёнаў тон. Так што распрацоўка і прамысловая эксплуатацыя гэтых радовішчаў — справа найбліжэйшай будучыні. Кіраўнік дзяржавы звярнуўся да будаўнікоў і сардэчна падзякаваў ім за добрасумленную працу, стараннасць у рабоце, годны ўклад у дасягненне Туркменістанам высокіх мэт, пажадаў моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і паспяховага завяршэння будаўніцтва грандыёзнага горна-ўзбагачальнага комплексу, разам з якім паўстане і пачне расці новы цудоўны горад.

Будаўніцтва ў раёне Гарлыкскага радовішча горна-ўзбагачальнага комплексу па вытворчасці амаль 1,4 мільёна тон калійных угнаенняў у год стане адпраўным пунктам для новых высокіх дасягненняў у засваенні найбагацейшых падземных кладовак, надзейным гарантам няўхільнага павышэння ўзроўню дабрабыту туркменскага народа і ўмацавання эканамічнай моцы дзяржавы.

Вусце ствала: адсюль пачнецца здабыча калійных угнаенняў.

Новая тэхналогія праходкі шахтных ствалоў — надзейнасць іх эксплуатацыі.

Прэзідэнт Туркменістана і прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь узялі ўдзел у прэзентацыі праектаў будаўніцтва горна-ўзбагачальнага комплексу, падрыхтаваных Дзяржканцэрнам «Туркменхімія» і ААТ «Белгархімпрам». У прадстаўленых макетах быў наглядна прадэманстраваны аб'ём ужо ажыццёўленых работ і ход далейшай рэалізацыі праекта, узвядзенне прадугледжаных ім аб'ектаў, у тым ліку розных узбагачальных фабрык.

Будавацца гэты прамысловы гігант будзе ў дзве чаргі. Каб уявіць размах, тэхнічную складанасць праекта, дастаткова назваць кошт першай чаргі комплексу — каля мільярда долараў ЗША. У цэлым на засваенне Гарлыкскага радовішча Туркменістан плануе накіраваць да 2 млрд долараў ЗША!

Са справаздачай аб праведзенай рабоце на аснове перадавых тэхналогій і строгага захавання аховы працы, патрабаванняў экалагічнай бяспекі выступілі начальнік упраўлення мінеральных угнаенняў Дзяржканцэрна «Туркменхімія» Ю. Марамуха і генеральны дырэктар ААТ «Белгархімпрам» С. Шэмет.

Так, з пачатку будаўніцтва горна-ўзбагачальнага комплексу ў адпаведнасці з графікам не толькі выкананы ўсе неабходныя геолагаразведачныя работы і падрыхтавана дэталёвая праектная дакументацыя, але і ўзведзены на прампляцоўцы першыя будынкі. У цяперашні час пачалося размяшчэнне заказаў на выраб у адпаведнасці з патрабаванымі тэхнічнымі характарыстыкамі абсталявання і механізмаў, якія будуць пастаўлены ад вядучых вытворцаў Германіі, Расіі, Беларусі і іншых краін. Ажыццяўляецца праходка вертыкальных шахтных ствалоў, узведзена селезасцерагальная дамба, вядуцца работы па ўзвядзенні розных дапаможных аб'ектаў комплексу. Паблізу будаўнічай пляцоўкі комплексу падняліся дамы першай чаргі жылога гарадка будаўнікоў новага камбіната. Прэзідэнт Туркменістана выказаў думку аб мэтазгоднасці адкрыцця ў Туркменабаце вучэбнага цэнтра для падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, каб у будучыні забяспечваць кадрамі горна-ўзбагачальны камбінат. У гэтай сувязі лідар нацыі даручыў адпаведным кіраўнікам вывучыць магчымасці і прапрацаваць пытанне аб стварэнні такога цэнтра з прыцягненнем досведу беларускіх спецыялістаў.

Варта адзначыць, што стварэнне ў краіне гэтага кірунку прафесійнай падрыхтоўкі дазволіць больш комплексна развіваць горназдабыўную галіну, якая мае вялікія перспектывы, і да таго ж не такія аддаленыя.

Кіраўнік дзяржавы Гурбангулы Бердымухамедаў і прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч агледзелі шахты, якія будуюцца, і падрабязна азнаёміліся з тэхналагічнымі метадамі апрацоўкі калійных пластоў.

УНП 600024712.

ПА ВЫНІКАХ сустрэчы Прэзідэнтам Туркменістана і прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь была дадзена высокая ацэнка працы калектыву адкрытага акцыянернага таварыства «Белгархімпрам».

У ЛОШЫЦКІМ ПАРКУ ЦЯПЕР НЕ ЗАКУРЫШ

Тэрыторыя палаца-паркавага комплексу стала дзясятым свабодным ад цыгарэтнага дыму месцам у Мінску.

— Пакуль што мы толькі пачынаем рыхтаваць да ўсталявання шыльдачкі, якія будуць нагадваць пра забарону курэння на тэрыторыі парку, — расказаў **начальнік упраўлення па абароне раслін і ўтрыманні аб'ектаў гарадскога добраўпарадкавання прадпрыемства «Мінскзелянбуд» Анатоль АЎДЗЯЕВІЧ.** — Мяркуецца, што іх усталююць там, дзе звычайна найбольшая канцэнтрацыя народу: каля дзіцячай пляцоўкі, каля будынка флігеля, на ўваходах у парк. Паліць цяпер можна будзе толькі ў спецыяльных альтанках, якіх у парку тры.

Пакуль інфармацыйныя шыльды аб забароне курэння не ўсталяваныя, супрацоўнікі праваахоўных органаў будуць нагадваць курцам пра неабходнасць паліць у спецыяльна адведзеным для гэтага месцы.

Шыльды і тлумачэнні — гэта, вядома, цудоўна. Але ці не ігнаруюць мінчане такія меры? Як расказаў **супрацоўнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй САСОНКА,** за мінулы год 387 грамадзян былі прыцягнуты да адказнасці за курэнне ў забароненым месцы. За такое парушэнне сёння можна атрымаць штраф у памеры да чатырох базавых велічынь (35—140 тысяч рублёў).



ДЫМІЦЬ ТАКСАМА НЕЛЬГА:

- на плошчы Незалежнасці і прылеглых тэрыторыях
- на прыпынках грамадскага транспарту
- у падземных пераходах
- у ветэранскім дворыку на вул. Цікоцкага, 46
- у парках Чалюскінцаў і Горкага
- у Батанічным садзе
- у Мінскім заапарку
- у парку «Дрымлэнд»
- у парку 60-годдзя Кастрычніка
- у Аляксандраўскім скверы
- ва ўсіх установах адукацыі і аховы здароўя
- на лесвічных пляцоўках шматкватэрных дамоў

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Выбухнуў газавы балон

Гэта здарылася ўдзень у Навагрудку па вуліцы Гагарына. Выбух газа-паветранай сумесі адбыўся без наступнага гарэння ў гаспадарчай пабудове.

У выніку апёкі цела — твару, шыі, рук — першай-трэцяй ступені (20-25 працэнтаў паверхні) атрымаў 40-гадовы сваяк гаспадара дома, які быў шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы. Стан пацярпелага быў цяжкім. У выніку выбуху разбураны сцены, перакрыцці і дах блочнага хлява. Як мяркуецца, прычынай здарэння стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні пацярпелага ў памяшканні з негерметычным газавым балонам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОАО «ЛИФТСЕРВИС»
ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ГОДОВОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 16 февраля 2012 г. по адресу:
г. Минск, Велосипедный пер., 5, 4 этаж, актовый зал.
Регистрация участников собрания **с 12.00 до 12.45.**
Начало работы собрания **в 13.00.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 г. и основных показателях производственной программы и финансового плана на 2012 год.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
4. О выборах Наблюдательного совета Общества.
5. О выборах Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционер ОАО «Лифтсервис» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь **паспорт и доверенность.**

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

УНП 100088852. **Наблюдательный совет.**

ОАО «Гомельхлебопродукт»
извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт»
03 февраля 2012 года.
Повестка дня:
1. О внесении изменений в устав ОАО «Гомельхлебопродукт».

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 15.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, в отделе кадров, тел. (8 0232) 78 46 45.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».

УНН 400010980

СКАРДЗІЦЦА БУДЗЕМ ПА-НОВАМУ

У кожнага з нас хоць раз у жыцці здараецца нагода паскардзіцца ў органы ўлады. На чыноўніка, ЖЭС, прадаўца... І каб атрымаць хуткі, дакладны, кампетэнтны адказ і рашэнне праблемы, трэба скардзіцца правільна. З 22 студзеня ў Беларусі ўступіў у сілу новы Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Якія новаўвядзенні ён прадугледжвае? Пра гэта «Звяздзе» распавёў намеснік начальніка ўпраўлення канстытуцыйнага заканадаўства Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі Мікалай САВАНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Скардзімся праз інтэрнэт

Адным з галоўных новаўвядзенняў закона з'яўляецца наступнае патрабаванне да дзяржаўных органаў і арганізацый: цяпер нароўні з пісьмовымі яны будуць абавязаны разглядаць і электронныя звароты. Як сцвярджае Мікалай Савановіч, такія звароты могуць быць накіраваны двума спосабамі: на афіцыйны адрас электроннай пошты дзяржаўнай арганізацыі або шляхам размяшчэння ў спецыяльнай рубрыцы на афіцыйным сайце дзяржарганізацыі (такія рубрыкі павінны неўзабаве з'явіцца на ўсіх афіцыйных сайтах дзяржорганаў і арганізацый).

ДАРЭЧЫ

Пісьмовы зварот можа адпраўляцца кур'ерам, па пошце, быць пададзены падчас асабістага прыёму або шляхам унясення заўвагі ў кнігу заўваг і прапаноў. Звароты, пададзеныя якім-небудзь іншым спосабам (напрыклад, па факсе) разглядацца не будуць.

Патрабаванні да зместу электроннага звароту аналагічныя патрабаванням да пісьмовага звароту. Трэба будзе абавязкова пазначыць свае даныя (прозвішча, імя і імя па бацьку, адрас, па якім мы пражываем) і выкласці сутнасць праблемы. Замест подпісу трэба будзе напісаць адрас сваёй электроннай пошты.

Адказ прыйдзе на ўказаны электронны адрас. Пры гэтым сканаванне бланка альбо подпісу службовай асобы, якая адказвае, не патрабуецца. Калі ж мы хочам атрымаць пісьмовы адказ на свой электронны зварот, у нас ёсць і такая магчымасць — трэба толькі напісаць пра гэта.

Дарэчы, электронныя звароты, па словах нашага суразмоўцы, абавязаны разглядаць толькі дзяржаўныя органы і арганізацыі. На арганізацыі з прыватнай формай уласнасці гэтае патрабаванне закона не распаўсюджваецца. І яшчэ: калі зварот (пісьмовы альбо электронны) не будзе змяшчаць кантактных звестак чалавека, які звярнуўся, ён будзе лічыцца ананімным і разглядацца не павінен.

Асабісты прыём «пад кантролем»

Закон дазваляе пры правядзенні асабістага прыёму выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі — аўдыя- і відэазапісы, фотаздымкі. Многія неадназначна ўспрынялі такі крок: выказваліся асцярогі, што дзяржава спрабуе такім чынам кантраляваць сваіх грамадзян. На самой справе, як запэўнівае Мікалай Савановіч, усё якраз наадварот. Людзі часта скардзяцца, што падчас асабістага прыёму службовыя асобы паводзяць сябе некарэктна: даюць недакладныя тлумачэнні, уводзяць у зман, хамяць і г.д. Але, як правіла, даказаць такія факты вельмі праблематычна. Таму з мэтай папярэджання падобных паводзін сярод службовых асоб, павышэння іх адказнасці за разгляд зваротаў (і, з другога боку, каб выключыць неабгрунтаваныя скаргі на нетактоўныя іх паводзіны) уводзіцца падобная норма.

Пры гэтым закон прадпісвае, што тэхнічныя сродкі могуць прымяняцца толькі па рашэнні кіраўніка арганізацыі і толькі пры ўмове папярэдняга паведамлення грамадзяніну аб іх ужыванні. Калі чалавек не жадае, каб яго гутарку са службовай асобай запісвалі на дыктафон альбо на відэакамеру, ён можа адмовіцца ад вуснага звароту і, накіраваўшы пісьмовы або электронны зварот, атрымаць на свае пытанні вычарпальны адказ.

Яшчэ адна навіна тычыцца непасрэдна працы чыноўнікаў: ад іх будзе патрабавацца, каб адказ на зварот накіроўваўся на той мове, на якой ён напісаны.

Каб не марнаваць час дарма...

Закон патрабуе, каб зварот падаваўся менавіта ў той орган, які ўпаўнаважаны разглядаць пэўнае пытанне, патлумачыў Мікалай Савановіч. На жаль, у нас скаргі накіроўваюцца ў розныя арганізацыі, у тым ліку і такія, якія даволі часта ніякага дачынення да пастаўленага пытання не маюць. Цяпер такія звароты будуць альбо перанакіроўвацца, альбо адпраўляцца назад заяўніку з растлумачэннем, куды яму неабходна звярнуцца. Пры гэтым звароты са скаргамі на судовыя пастановы будуць ва ўсіх выпадках вяртацца назад заяўнікам з тлумачэннем парадку перагляду такіх пастаноў.

Таму, каб не марнаваць дарма час і адразу накіраваць зварот у патрэбную арганізацыю, наш суразмоўца раіць адразу высветліць, да кампетэнцыі якога органа ўлады або службы адносіцца ваша прэтэнзія, і накіраваць сваю пісьмовую скаргу на адпаведны адрас. Пералік дзяржаўных органаў, упаўнаважаных разглядаць тыя ці іншыя звароты, па яго словах, змешчаны ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 498 «Аб дадатковых мерах па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб», з якім можна пазнаёміцца ў прававой сістэме «Эталон». Альбо можна ўдакладніць неабходную вам арганізацыю ў аддзеле па працы са зваротамі грамадзян мясцовага выканкама.

ТЭРМІНЫ РАЗГЛЯДУ ЗВАРОТАЎ

Звычайны зварот (пісьмовы альбо электронны) разглядаецца ў тэрмін, які не перавышае 15 дзён. Калі ж ён патрабуе дадатковай праверкі (запыту інфармацыі ў іншых дзяржаўных органах, выезду на месца і інш), то разглядаецца на працягу месяца.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

Службовыя асобы, вінаватыя ў нядобрасумленных, павярхоўных адносінах да разгляду зваротаў насельніцтва, могуць быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафных санкцый на суму ад 4 да 20 базавых велічынь. Асобны артыкул прадугледжвае адказнасць за парушэнне заканадаўства аб заўвагах і прапановах, унесеных у кнігу заўваг і прапаноў. Яна складае ад 4 да 10 базавых велічынь. Акрамя гэтага, на чыноўнікаў можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне аж да вызвалення ад займаемай пасады.

І АБ «ПРАФЕСІЙНЫХ СКАРЖНІКАХ»...

Сярод людзей, якія звяртаюцца ў органы ўлады, ёсць так званыя «прафесійныя скаржнікі», што закідваюць дзяржустановы сваімі пасланнямі. У выніку тыя марнуюць вялікую колькасць часу і сродкаў на разгляд зваротаў, якія нярэдка першапачаткова ўтрымліваюць няпэўную інфармацыю.

Паводле новага закона, з чалавека, які падаў зварот з загадзя недакладнай інфармацыяй, у судовым парадку могуць быць спагнаныя сродкі, затрачаныя на разгляд яго скаргі. Напрыклад, кошт праведзеных экспертыз, кошт камандзіровачных расходаў супрацоўнікаў установы, кошт норма-гадзін, выдаткаваных на разгляд звароту.

Акрамя таго, калі адзін і той жа заяўнік сістэматычна звяртаецца ў адну і тую ж арганізацыю з рознымі пытаннямі, якія не знаходзяць свайго пацвярджэння, з яго таксама могуць быць спагнаны сродкі за разгляд яго скаргаў. Прадугледжана, па словах спецыяліста, і адказнасць за выкарыстанне ў заяве паклёпу або абраз.

Святлана БУСЬКО.

НАШЫ ПАРАДЫ

ЯК ПРАВІЛЬНА НАПІСАЦЬ СКАРГУ

— У правым верхнім ражку неабходна ўказаць поўную назву органа і службовай асобы, якім накіроўваецца прэтэнзія.

— Крыху ніжэй напісаць прозвішча, імя і адрас заяўніка.

— Далей можна прыступаць да апісання самой прэтэнзіі. У апісанні пажадана максімальна падрабязна адзначыць усе вядомыя вам звесткі аб асобе, на чые дзеянні вы падаяце скаргу (прозвішча, імя, імя па бацьку, званне, займаемая пасада, месца працы, нумар службовага пасведчання, нагруднага знака, адрас і г.д.). Тут жа апісваеце абставіны, пры якіх адбылося парушэнне вашых правоў, даяце падрабязныя звесткі аб асобах, якія могуць пацвердзіць факт парушэння. Калі вы можаце падаць дакументальныя сведчанні — яшчэ лепш. Пастаўце ў скарзе спасылкі на адпаведныя дакументальныя сведчанні. Калі ж ёсць такія дакументы, прыкладзіце іх копіі да прэтэнзіі. Калі вы валодаеце інфармацыяй аб палажэннях дзейнага заканадаўства, дзе адзначаны вашы правы, — пазначце тут жа нумары, назвы і пункты адпаведных нарматыўных і заканадаўчых актаў.

— Калі вы прыкладваеце да скаргі копіі дакументаў, у канцы прэтэнзіі напішыце іх пералік, з указаннем колькасці экзэмпляраў.

— Пастаўце дату і свой подпіс.

ДАХІ НЕ ВЫТРЫМАЛІ ЦЯЖАРУ СНЕГУ

У ноч на 23 студзеня ў Мінску па праспекце Незалежнасці на стаянцы СТА часткова абрынуўся дах-навес. Яго агульны памер складаў 8х20 метраў.

На шчасце, абышлося без пацярпелых. У выніку здарэння былі пашкоджаны чатыры аўтамабілі. Мяркуецца, што абрушэнне адбылося з-за цяжару снегу. Абставіны высвятляюцца.

— 23 студзеня а палове чацвёртай гадзіны раніцы з-за масы снегу абрынуўся дах склада, што месціцца па вуліцы Вайсковай. Ён належыць Гомельскаму навукова-вытворчаму камерцыйнаму цэнтру ААТ «Кутэкс». Пра здарэнне паведаміў ахоўнік, — расказаў старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС Алег Малевіч. — На месцы высветлілася, што абрынуўся адзін скат металічнага даху на плошчы 3,2 тысячы квадратных метраў і 120 квадратных метраў цаглянай сцяны склада. У выніку быў пашкоджаны аўтамабіль «Фальксваген Гольф» работніка прадпрыемства і электрычны пагрузчык.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЖАР У ЛАЗНІ

У вёсцы Бычыха Гарадоцкага раёна ноччу адбыўся пажар у лазні, якая належыць Гарадоцкаму прадпрыемству камунальных і цеплавых сетак. Як мяркуецца, прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі пячнога ацяплення. Падчас ліквідацыі пажару выратавалі матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 50 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Доктар адкажа

ПРЫШЧЭПКА АД ГЕПАТЫТУ В — НЕБЯСПЕЧНАЯ?

«УРАЧЫ пастаянна кажуць аб неабходнасці вакцынацыі дзяцей. Аднак я чула, што прышчэпкі ад гепатыту В істотна аслабляюць імунітэт немаўлят, а таксама эфект ад іншых прышчэпак... Ці так гэта?
Вольга, *г. Мінск*».

— Зараз у Беларусі ад гепатыту В прышчэпленыя каля 200 тысяч дзяцей, — кажа ***загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ШЫМАНОВІЧ.*** *— Такая прышчэпка сёння выконваецца ва ўсім свеце. З 2000 года яна робіцца ўсім нованароджаным і ў Беларусі — на працягу першых 24-х гадзін жыцця. Акрамя таго, у нас ёсць і катэгорыя 13-гадовых, якім таксама выконваецца вакцынацыя супраць гепатыту В. У 2014 годзе ў нас ужо не будзе падлеткаў, якім трэба рабіць падобную вакцынацыю. Тады мы будзем прышчэпліваць толькі немаўлят. Зараз мы ахопліваем 97 працэнтаў усіх народжаных, што з'яўляецца вельмі добрым паказчыкам.*

Прышчэпка не выклікае ніякіх ускладненняў і не павінна выклікаць апасенняў, паколькі вырабляецца і выкарыстоўваецца ў іншых краінах даволі даўно. Між тым, гепатыт В сёння лічыцца вельмі распаўсюджанай інфекцыяй і наносіць непапраўную шкоду здароўю чалавека. Захворванне перадаецца як парантэральным шляхам — праз кроў, так і шляхам палавым. Рызыка перадачы інфекцыі захоўваецца нават у касметычных і стаматалагічных кабінетах, а таксама ў хатніх умовах — напрыклад, пры выкарыстанні чужой брытвы.

Што датычыць дарослых, якія не прышчэпліваліся ў дзяцінстве, але маюць намер прайсці вакцынацыю, то гэтым пытаннем трэба пацікавіцца ў паліклініцы па месцы жыхарства. Мінчанам можна звяртацца адразу ў Гарадскі цэнтр імунапрафілактыкі, што на базе Мінскай гарадской дзіцячай клінічнай інфекцыйнай бальніцы. У абавязковым парадку прышчэпку ад гепатыту В атрымліваюць зараз усе медыцынскія работнікі...

Вакцынацыя — ратаванне ад эпідэмій

Да ўвядзення планавай імунізацыі дзяцей інфекцыйныя хваробы з'яўляліся асноўнай прычынай дзіцячай смяротнасці, а эпідэміі здараліся досыць часта. Вакцынапрафілактыка змяніла гэтую сітуацыю. Захворванасць на тыя інфекцыі, у дачыненні да якіх праводзіцца вакцынацыя, істотна знізілася, амаль да ліквідацыі некаторых з іх.

Першай інфекцыяй, якую ўдалося ліквідаваць з дапамогай вакцынацыі, стала натуральная воспа. У давакцынальны час воспа штогод забірала 5 млн жыццяў. Пачынаючы з 1978 года, натуральная воспа нідзе не рэгіструецца.

Яшчэ адна вельмі цяжкая дзіцячая інфекцыя — поліяміэліт, якая прыводзіць практычна да пажыццёвай інваліднасці, сёння таксама не рэгіструецца ў абсалютнай большасці краін свету. Еўрапейскі рэгіён аб'яўлены свабодным ад поліяміэліту ў 2002 годзе.

Мяркуецца, што ў бліжэйшай будучыні ўдасца ліквідаваць і іншыя інфекцыі. У еўрапейскім рэгіёне пастаўлена мэта перамагчы адзёр і краснуху.

Згодна з нацыянальным календаром прышчэпак, у Беларусі ажыццяўляецца планавая вакцынацыя супраць поліяміэліту, дыфтэрыі, коклюшу, слупняку, адру, краснухі, паратыту, гепатыту В і туберкулёзу. Акрамя таго, па эпідэміялагічных паказаннях праводзіцца вакцынацыя супраць цэлага шэрагу інфекцыйных захворванняў — грыпу, клешчавага энцэфаліту, гепатыту А і інш. Дзякуючы высокаму ахопу насельніцтва планавай вакцынацыяй у краіне дасягнуты вялікія поспехі ў барацьбе з інфекцыямі. Істотна знізілася захваральнасць на паратыт і гепатыт В. Выяўляюцца адзінкавыя выпадкі дыфтэрыі, адру і краснухі ў год.

Аднак праблема інфекцыйных захворванняў — гэта праблема заўсёды міжнародная. Інфекцыйныя агенты лёгка перасякаюць межы і распаўсюджваюцца з адной краіны ў іншую. Імпартаванне інфекцый з краіны ў краіну і нават з аднаго рэгіёну свету ў іншы сёння здараецца даволі часта. З гэтай праблемай наша краіна сутыкнулася ў 2006 г., калі пасля працяглага зацішша зноў пачалі рэгістравацца выпадкі адру. Усяго на працягу 2011 года было зарэгістравана 50 выпадкаў адру, і ўсе яны былі завезены з-за мяжы.

Таму вельмі важна пастаянна падтрымліваць высокі ўзровень ахопу прышчэпкамі, што дазволіць забяспечыць высокі ўзровень імунітэту ў папуляцыі. У Беларусі ахоп прышчэпкамі супраць інфекцый досыць высокі — 97 працэнтаў і вышэй. Аднак у цэлым па еўрапейскім рэгіёне ахоп прышчэпкамі складае ў сярэднім 90 працэнтаў, што усё ж такі не з'яўляецца аптымальным. У некаторых краінах па асобных інфекцыях ён нават ніжэй за 90 працэнтаў.

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі ў Еўропе адзін з найбольш нізкіх узроўняў захваральнасці на тыя інфекцыі, якія можна папярэдзіць з дапамогай вакцынацыі. Аднак, паводле разлікаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у еўрапейскім рэгіёне па віне хвароб, якіх можна было пазбегнуць з дапамогай вакцынацыі, штогод памірае 32 тыс. дзяцей.

Імунізацыя — адна з тых рэдкіх паслуг, якая каштуе няшмат, але дае пры гэтым вялікую карысць для здароўя і дабрабыту ўсяго насельніцтва.

Святлана БАРЫСЕНКА.

РЫБАКІ ВЫЙШЛІ НА НЕТРЫВАЛЫ ЛЁД...

ЗА мінулыя выхадныя ў краіне некалькі разоў ратавалі людзей, што праваліліся пад лёд.

— У суботу ў 14.15 відавочцы патэлефанавалі сталічным выратавальнікам: на Чыжоўскім вадасховішчы тонуць два чалавекі, — распавёў «Звяздзе» старшы **інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч.** — Два рыбакі знаходзіліся за 50 метраў ад берага ў палонцы памерам 1х2 метры. Мужчын — а гэта былі бацька з сынам (адпаведна, 1952 і 1977 гадоў нараджэння) — выратавалі і перадалі медыкам. Пасля агляду пацярпелых даставілі дадому.

У нядзелю а палове 12 гадзіны работнікам МНС давялося ратаваць мужчыну, які праваліўся пад лёд на возеры Белае паблізу вёскі Гатовічы Мядзельскага раёна.

— За крыху больш чым 10 хвілін нештатная вадалазна-выратавальная група Мядзельскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях пераадолела 14 кіламетраў. Медыкі ўжо чакалі на беразе, — паведаміла рэдакцыі **старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк.** — Чалавек знаходзіўся за 120 метраў ад берага. Паколькі знаходжанне на лёдзе групы людзей было рызыкоўным, начальнік дзяжурнай змены малодшы лейтэнант унутранай службы Аляксандр Купрэвіч вырашыў дзейнічаць адзін. Яго прафесіяналізм і рашучасць далі плён: чалавек быў выратаваны і з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Мядзельскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Як расказалі іншыя рыбакі, сведкі здарэння, пацярпелы пэўны час спакойна лавіў рыбу, пакуль не вырашыў змяніць месца. І зайшоў занадта далёка...

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нагадвае: зараз з-за нестабільнага тэмпературнага рэжыму, наяўнасці цячэнняў і іншых фактараў лёд на вадаёмах у некаторых месцах недастаткова трывалы. Будзьце пільнымі!

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.10	17.34	8.24
Віцебск —	9.05	17.18	8.13
Магілёў —	9.00	17.24	8.24
Гомель —	8.50	17.27	8.37
Гродна —	9.24	17.50	8.26
Брэст —	9.18	17.57	8.39

Месяц

Маладзік 23 студзеня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара.*

К. *Мілены, Феліцыі, Эрыкі, Рафала, Роберта, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

24 студзеня

1895 год — у Мінску ўведзена ў дзеянне першая электрастанцыя. Найбуйнейшая ў Беларусі з ліку муніцыпальных. Знаходзілася на правым беразе Свіслачы, побач з сучасным будынкам Беларускага дзяржаўнага цырка. Увод гэтай электрастанцыі дазволіў усталяваць у горадзе 390 лямпачак напальвання: 140 для асвятлення вуліц Петрапаўлаўскай, Праабражэнскай, Губернатарскай, Захар'еўскай, 140 у зімовым і летнім тэатрах і 110 у прыватных спажыўцоў. Гараджане хутка ацанілі перавагу новага віду асвятлення, і ўжо праз тры гады горад меў 1100 лямпачак напальвання ў 16 свечак: 240 — на вуліцах, 420 — у тэатрах і 430 — у прыватным спажыванні. Пасля 1905 года з'явіліся і першыя электралямпы вольтавай дугі. Яны перыядычна запальваліся ў тэатры, цырку, на гуляннях.

1848 год — нейкі Джэймс Маршал, які працаваў на лесапільні ў Каліфорніі, знайшоў залаты злітак. Гэта паслужыла пачаткам «залатой ліхаманкі», так яскрава пазней апісанай у прыгодніцкай літаратуры і паказанай у вестэрнах. Тысячы людзей з усіх канцоў Амерыкі, а затым і ўсяго свету рынуліся ў Каліфорнію на пошукі золата. Некаторыя з іх сталі мільянерамі, але большасць згалела. Каліфорнія спачатку прыйшла ў заняпад — усе дарослыя мужчыны кінулі сваю працу. З-за гэтага, у прыватнасці, разарылася лесапільня, на якой працаваў той самы Джэймс Маршал. Нават Сан-Францыска цалкам апусцеў. Аднак прайшоў час, і каліфарнійскія гарады расквітнелі дзякуючы велізарнаму прытоку насельніцтва. Няўдачлівыя золаташукальнікі аказаліся таннай рабочай сілай для мясцовых прадпрыемстваў, а тыя, хто ўсё-ткі знайшоў золата, укладвалі яго ў мясцовую эканоміку. Пачалося ператварэнне Каліфорніі ў штат мільянераў. Але гэта было потым, а сціплы рабочы Джэймс Маршал, які мімаволі запусціў увесь гэты працэс, памёр у трухлявай хаціне. Сёння яму пастаўлены помнік у тым месцы, дзе быў знойдзены першы самародак.

Цытата дня

«Не трэба баяцца з жыццём паспрачацца і праўду сваю даказаць».
Аркадзь Чарнушэвіч (1912—1967), беларускі пісьменнік.

На ўзлеску — міны

Ля вёскі Дуброва Светлагорскага раёна меліяратары натрапілі на склад боепрыпасаў. Першапачаткова ў лясным масіве была знойдзена адна мінамётная міна, пра што паступіла інфармацыя ў раённую міліцыю. Пасля дадатковага абследавання тэрыторыі выяўлена яшчэ 56 узрывальнікаў і 42 міны калібру 82 мм часоў Вялікай Айчыннай вайны. Усе боепрыпасы савецкай і нямецкай вытворчасці добра захаваліся, таму ўяўлялі вялікую небяспеку. Сапёры вайсковай часці 5527 прынялі рашэнне: знішчыць іх на месцы. Агульная вага выбуховага рэчыва ў трацілавым эквіваленце склала амаль 17 кг.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Усміхнемся!

— Ці ёсць разумнае жыццё ў сусвеце?

— Ёсць.

— А чаму з намі не звязваецца?

— Дык разумнае ж...

☺

Як праходзіць тыдзень: панядзеееееелак.... аўтоооорак.... серадаааааааа.... чацвееееееер.... пятніцасуботанядзеля.

☺

Калі ёй было 3 гадкі, яна бегала галышом па пляжы. Цяпер ёй 33, але пара бутэлек шампанскага дапамагае ёй вярнуцца ў дзяцінства.

☺

— У мяне ў ваннай з крана цячэ вада.

— А павінна што?

— Каньяк.

— Чаму гэта?

— Мяркуючы па «плацёжцы» за студзень...

ПРАКАВЕТНАЕ

У НОВІНАХ КАЛЯДУ ВЕЗЛІ, А Ў ЧЫЖАСЕ — НЕСЛІ

Але не забылі таксама зладзіць сёлета традыцыйнае развітанне з Калядамі і ў іншых вёсках Бярэзінскага раёна — Любушанах, Дзмітравічах, Галаўных Лядах. Гэтае свята мае даволі арыгінальную назву — «Цягнуць Каляду на дуба», якую на фальклорна-абрадавых абшарах Беларусі больш нідзе не сустрэнеш. Яно бытавала на Бярэзіншчыне і ў памежных з ёю раёнах і праводзілася толькі 21 студзеня — на трэці дзень пасля галоднай куцці.

У НОВІНАХ гэтае вясёлае гульбішча праводзіцца з 1998 года і стала неад'емнаю часткаю вясковага жыцця. Але сёлета бярэзінцаў узрушыла добрая падзея-навіна: абрад узяты пад ахову дзяржавы — рашэннем Рэспубліканскай рады па ахове гісторыка-культурнай спадчыны яму прысвоены статус нематэрыяльнай каштоўнасці. Ганаровае званне надаецца толькі жывой народнай традыцыі, што новінцы цягам жыцця і даказалі. Як і ў ранейшыя гады, у гэты дзень вёску наведалі тэлеаператары, фотажурналісты і работнікі культуры. Але сёлета іх было ажно занадта. І яно зразумела: не кожны дзень прысвойваюцца ганаровыя тытулы і званні. Усе хацелі засведчыць святочны настрой удзельнікаў, носьбітаў і захавальнікаў сапраўднага шэдэўра народнай культуры. А носьбітамі ў Новінах з'яўляюцца не толькі бабулькі і людзі старэйшага ўзросту, але і моладзь. І, галоўнае, — дзеці.

Дзе яшчэ сустрэнеш гэткую забаву, каб бабульку ўсаджвалі на санкі, побач з ёю ставілі жытнёвы снапок і цягнулі на край вёскі да дуба альбо іншага дрэва? Бярэзінцы ганарацца, што іх продкі ўзбагачалі сваё жыццё звычаямі і традыцыямі, праз якія выяўлялася вясёлая і багатая душа народа. Яны ўмелі выказваць свае адносіны да з'яў прыроды простымі і выразнымі сімваламі, якія і праз тысячы гадоў застаюцца і зразумелымі і, што цікава, суладнымі жыццю. Як яно было і з Калядамі. Добра нагуляўшыся, уволю пасвяткаваўшы, селянін не забываў, што наступаў час брацца за працу, думаць пра будучы ўраджай. Праводзіны Каляд з'яўляліся своеасаблівай кропкай пасля доўгіх святкаванняў, забаў і ігрышчаў — мяжою, за якой пачыналіся працоўныя клопаты пра хлеб, гаспадарку. Моладзь збіралася ў хаце, спявала развітальныя песні. Гаспадыня здымала з покуці абжаты снапок — сімвал урадлівасці і дабрабыту, выносіла чыгунок з куццёю. Садзілі на санкі самую паважаную бабулю, і вясёлая працэсія кіравала за вёску.

«Каляда, Каляда, Калядзіца,
Ты добрая маладзіца!
Мы цябе шанавалі, мы цябе частавалі!
А цяпер, наша люба, прывялі цябе да дуба».

У Новінах імкнуцца прытрымлівацца даўняй традыцыі і «Цягнуць Каляду да дуба» менавіта так, як рабілі продкі. Ніна Клімовіч — галоўная захавальніца абраду — да дробязяў распытала ў старэйшых аднавяскоўцаў, як трэба правільна яго праводзіць, што і як спяваць. Цяпер яе дзеці і ўнукі могуць самастойна, без апекі старэйшых зладзіць вясёлае свята і праспяваць: *«Ой, Калядачкі, вы на дуб, на дуб. А нам, дзевачкам, ды ніхто не люб...»*

Гэтым разам новінцы выбралі сабе дуб за вёскай Марцыянаўка, і нам, каб убачыць, як цягнуць Каляду, давялося пару кіламетраў адмахаць пешкі. А ў вёсцы Чыжаха жанчыны знайшлі прыгожае дрэва ледзь не за суседнім агародам (тут праводзіны Каляды звычайна ладзілі жанчыны і дзяўчаты). На кола ад прасніцы, упрыгожанае каласкамі з леташняга ўраджаю, чыжахскія святкавальніцы паставілі чыгунок з куццёю і панеслі яго, як пана, на руках. Каля дрэва іх ужо чакалі вяскоўцы, каб разам вадзіць карагоды вакол дуба, пагуляць у ката. Кацярына Карканіца загадзя спякла пірог у выглядзе хатняга любімца, прывязала яго да палкі і наладзіла спаборніцтва на выяўленне самага спрытнага юнака. Трэба ўмудрыцца скокнуць і адкусіць кату хвост ці лапку. Гэтая гульня заўсёды выклікае ўсмешкі і вясёлыя рэплікі. Фінал абраду — усцягванне Каляды (кола, бараны, саламянай лялькі, снапка на дрэва) і замацаванне да галін. З абавязковым прыгаворам-наказам ці просьбаю: *«Сядзі, Каляда, высока, глядзі, Каляда, далёка!»*

Свята ў Чыжасе, адной з самых аддаленых вёсак раёна, падмацоўвала баяніст і гарманіст з Беразіно Тамара Дземяшкевіч. Дужа душэўна спявалі застольныя песні жанчыны, радуючыся, што годна «зацягнулі Каляду на дуба», што за вокнамі лагодная зіма, што зноў прыйдзе вясна і будзе на стале хлеб і да хлеба.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Бярэзінскі раён.

На фотаздымках фрагменты свята-абраду ў вёсках Новіны і Чыжаха.

Крылы, якія падаравала Галіна Васілеўская

Днямі споўнілася паважаная юбілейная дата ў пісьменніцы Галіны Васілеўскай.

Больш за 50 гадоў працуе яна ў беларускай літаратуры. Была радыёжурналісткай, рэдактарам аддзела часопіса «Работніца і сялянка», адказным сакратаром часопіса «Полымя». Працавала дырэктарам Бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў. Першыя кнігі Галіны Васілеўскай, адрасаваныя дзецям, пабачылі свет у 1960-я — «Маланка ўначы», «Малюнак на снезе»... А былі яшчэ «Бывай, Грушаўка», «Крылы, або Адзін год з жыцця Віталя Пятроўскага», «Я еду на вярблюдзе...».

Кнігі Галіны Васілеўскай перакладаліся на рускую мову, знаходзілі чытача на ўсёй прасторы Савецкага Саюза. Пісьменніца з пільным даследчыцкім досведам унікала ў біяграфіі, лёсы юных герояў Вялікай Айчыннай вайны. Апавяданні, нарысы, аповесці на гэтую тэму, як на мой погляд, і зараз маглі б перавыдавацца. Чаму, напрыклад, адным зборнікам не ў той жа «Школьнай бібліятэцы»? Шмат што з напісанага Галінай Васілеўскай — выдатны ўнёсак у беларускую дзіцячую літаратуру.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Шчыра віншуем свайго калегу **Паўла БЕРАСНЕВА** з законным шлюбам! Зычым маладым дабрабыту (ільготных умоў на атрыманне жылля), здароўя і моцнага імунітэту ад усіх злых і нядобразычлівых людзей, ладу і ўзаемапаразумення! Няхай ваша маладая сям'я ніколі не старэе — мацуецца добрым настроем і малодзіцца ладненькімі нашчадкамі.

Звяздоўцы.

БЕСПРАЦОЎНАЯ Ў БЕСПРАЦОЎНАЙ

З кватэры беспрацоўнай, якая пражывае ў Баранавічах па вул. Камуністычнай, нехта выкраў 4250 долараў і залатыя ювелірныя вырабы. Аператыўнікі высветлілі, што падабрала ключы і залезла ў кватэру беспрацоўная жыхарка горада.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 344.
Нумар падпісаны ў 19.30 23 студзеня 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.